10.03.94




*Помнік ахвярам Лахвенскага гета ў Хулоне (Ізраіль). Узведзены ў 1977 г. на мемарыяльных могілках. Участак зямлі быў выдзелены і дазвол на будаўніцтва помніка атрыманы пасля таго, як жыхарка Варшавы (Польшча) Насця Рывіна па нашай просьбе з'ездзіла ў Лахву, узяла жменю зямлі і попелу з магілы ў Лахве і пераслала гэта праз ЗША ў Ізраіль. Яўрэі, якія жылі ў Лунінцы і Пінску, не адгукнуліся на нашу просьбу.*

*Помнік мае вышыню 2 метры, выраблены з чорнага базальту. Наверсе слова „Лахва", пад ім — 6-канцовая зорка Давыда і ручка сякеры — сімвала барацьбы Лахвенскага гета. Сякера з зоркай быццам выбіваюцца з цемры. На зорцы надпіс з бібліі: „И видел, что нет человека, и дивился, что нет спасителя, и помогала ему мышца его... и он возложил на себя шлем мести..." (прарок Ісая, глава 59, прад. 16 — 17).*

*Спіс ахвяр Лахвенскага гета потым быў увекавечаны на асобным камені.*

*Ієгашуа Ліхтштэйн-Ліор,*
*ураджэнец Лахвы, ветэран вайны,*
*грамадзянін Ізраіля.*